Выхоўваем сапраўдных беларусаў

Рэспубліканскі семінар для педагагічных работнікаў дашкольнай адукацыі, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі інавацыйнага праекта "Укараненне мадэлі арганізацыі працэсу патрыятычнага выхавання ва ўстанаве дашкольнай адукацыі (2015—2018)", прайшоў у Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі. Сустрэчу правяла навукавы кіраўнік праекта дацэнт БДПУ імя Максіма Танка Людміла Мікалаеўна Варанецкая.

"Работа па патрыятычным выхаванні праводзіцца з дзецьмі ад 3 да 6—7 гадоў, — паведаміла Людміла Мікалаеўна. — У 2015 годзе, калі мы пачалі рэалізоўваць свой інавацыйны праект у 17 установах дашкольнай адукацыі, у ім прынялі ўдзел больш за 1000 выхаванцаў. Сёння праектам ахоплена 3231 дзіця. Задачы патрыятычнага выхавання дашкольнікаў акрэслены ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі, а кірункі такой работы розныя. На першым плане — вывучэнне дзецьмі гісторыі Беларусі, яе сімвалаў і славутасцей, атрыманне ведаў аб дзяржаўных і народных святах, людзях, якія праславілі краіну, аб роднай мове, мастацтве, народных промыслах і творчасці, гульнях. Па гэтых кірунках у адпаведнасці з вучэбнай праграмай для кожнай узроставай групы былі вызначаны свае задачы, распрацаваны змест работы педагогаў-наватараў, падрабязна тлумачыцца, што павінны дзеці ведаць пра сябе і сваю краіну. Так, кожнаму дашкольніку важна ўсведамляць, што ён жыве ў соцыуме, ведаць адметнасці горада ці вёскі, дзе жыве яго сям'я, разумець, што такое Радзіма, і палюбіць яе. Менавіта такія галоўныя вынікі прадугледжвае работа па інавацыйным праекце".

дучыні, якую карысць прынясуць грамадству.

Педагогі-наватары ствараюць метадычныя распрацоўкі, якія апрабоўваюць у сваіх установах, а пасля прадстаўляюць на ўзроўні горада, раёна, вобласці падчас метадычных нарад і семінараў. Гэта канспекты заняткаў, гульні, метадычныя рэкамендацыі, сцэнарыі мерапрыемстваў з удзелам бацькоў. Педагогі пішуць навуковыя артыкулы, справаздачы, аналітычныя даведкі, праводзяць дыягностыку і майстар-класы. Некаторыя ўстановы сёлета плануюць удзельнічаць у фінале II Міжнароднага конкурсу аўтарскіх метадычных распрацовак у сферы дашкольнай педагогікі "Мастацтва выхавання", які пройдзе ў Маскоўскім педагагічным дзяржаўным універсітэце.

* * *

"У адукацыйным працэсе мы шырока выкарыстоўваем музейную педагогіку, — расказала загадчык ДЦРД № 26 Мінска Ліліяна Генадзьеўна Стрэльская. — Ствараем міні-музеі — тэматычныя экспазіцыі, якія носяць часовы характар. У іх ліку — "Горад майстроў", "Беларуская цацка", "Беларуская хатка", "Мой родны горад", "Беларускія пісьменнікі — дзецям", "Кнігі нашага дзяцінства", "Ёлка ў нацыянальным сты-

Удзельнікі інавацыйнага праекта, прадстаўнікі 17 устаноў дашкольнай адукацыі краіны, падчас семінара расказалі аб сваім вопыце работы па патрыятычным выхаванні дашкольнікаў. Дашкольныя ўстановы, якія працуюць у інавацыйным рэжыме, сталі сапраўднымі сацыякультурнымі цэнтрамі ў сваіх рэгіёнах, ладзяць сумесныя праекты са школамі, бібліятэкамі, музеямі, дамамі культуры. Напрыклад, ДЦРД Веткі цесна ўзаемадзейнічае з Веткаўскім музеем старавераства і беларускіх традыцый імя Ф.Р.Шклярава.

За апошнія гады амаль кожны дзіцячы сад расказаў жыхарам свайго горада ці пасёлка аб інавацыйнай рабоце па мясцовым тэлебачанні.

Многія ўстановы накіравалі свае намаганні на пошук і апрабацыю эфектыўных форм і метадаў работы з бацькамі. Шматлікія мерапрыемствы і праекты педагогі-наватары рэалізуюць на беларускай мове. Напрыклад, у ДЦРД № 214 Мінска выхавальнікі займаюцца распрацоўкай беларускамоўных лэпбукаў па ўсіх кірунках патрыятычнага выхавання і выкарыстоўваюць іх пры правядзенні заняткаў. У яслях-садзе № 13 Магілёва створана серыя тэлеперадач "Размаўляем па-беларуску". У інавацыйным праекце таксама ўдзельнічаюць беларускамоўныя сады, у прыватнасці Гальшанскі яслі-сад Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці, ДЦРД № 61 "Праменьчык" Брэста. Падчас семінара ўстановы прадставілі цікавы вопыт правядзення беларускамоўных тыдняў (1 раз у месяц), відэагасцёўняў для бацькоў і дзяцей, а таксама стварэння відэакліпаў пра Беларусь, падрыхтоўкі інсцэніровак на беларускай мове.

Выхаванцы, удзельнікі праекта, на ўсіх мерапрыемствах выступаюць як сапраўдныя беларусы, з гонарам расказваюць аб славутасцях роднага краю, яго прыродных, гістарычных, архітэктурных і культурных адметнасцях. Яны разважаюць аб тым, кім стануць у будучыні, "Воінская доблесць і слава", "Ніхто не забыты, нішто не забыта", "Школьная пара". Як правіла, бацькі і дзеці ўдзельнічаюць у фарміраванні гэтых экспазіцый, а ў ролі экскурсаводаў выступаюць педагогі або выхаванцы старэйшага дашкольнага ўзросту, якія знаёмяць з музейнымі экспанатамі сваіх равеснікаў або дзяцей малодшага ўзросту. Экспанаты можна браць у рукі і разглядаць, што садзейнічае лепшаму засваенню матэрыялу".

Педагогі цэнтра знаёмяць дашкольнікаў з традыцыямі, славутасцямі нашай краіны і знакамітымі людзьмі Беларусі, Мінска і Партызанскага раёна сталіцы, на тэрыторыі якога размяшчаецца ДЦРД № 26. Праводзяць тэматычныя заняткі: "Віртуальная экскурсія па родным горадзе" (адукацыйная галіна "Дзіця і грамадства"), інтэграваныя заняткі "Слуцкія паясы" (адукацыйныя галіны "Дзіця і грамадства", "Мастацтва") і інш.

Дзеці знаёмяцца з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам Беларусі. Метадычная распрацоўка — канспект заняткаў "Золата саломкі", якую педагогі цэнтра прадстаўлялі ў Маскве на і Міжнародным конкурсе аўтарскіх метадычных распрацовак у сферы дашкольнай педагогікі "Мастацтва выхавання", атрымала дыплом III ступені. У 2017 годзе, да 40-годдзя Партызанскага раёна Мінска, педагогі цэнтра разам з дзецьмі і іх бацькамі складалі буклеты, арганізоўвалі выставы аб людзях, якія праславілі раён, а таксама наведвалі гэтых знакамітых мінчан.

Ва ўстанове рыхтуюцца драматызацыі беларускіх народных казак, ладзяцца конкурсы па стварэнні газет, на лепшы праект "Мой любімы Партызанскі раён", сумеснай творчасці дзяцей і бацькоў "Складаем казкі разам". ДЦРД № 26 наладзіў супрацоўніцтва з многімі музеямі сталіцы, якія праводзяць для выхаванцаў экскурсіі, адаптаваныя да іх узросту, запрашаюць на майстар-класы.

Надзея ЦЕРАХАВА.
terekhova@ng-press.by